***А. Г. Антанюк***

# СЛОВА АБ МАЦІ



Пры ўспамінах аб маці ў мяне ўзнікаюць выключна светлыя вобразы. Вясна, зялёнае лісцедрэў, сонца, цеплыня, каханне… Менавіта гэтыя асацыяцыі прыходзяць, калі я думаю пра дзяцінства і маці. Нездарма яна нарадзілася ў сярэдзіне вясны, у той перыяд, калі новае жыццё канчаткова бярэ верх над зімовай спячкай. Менавіта такім чалавекам – бадзёрым, поўным жыцця, прасякнутым аптымізмам і верай у лепшае – і была мая мама. І гэты аптымізм перадаваўся блізкім ёй людзям. Яе энергіі хапала на сям'ю, сяброў, калег, суседзяў, сваякоў.



Санаторый Белая Русь, г. Туапсэ. Вясна 1999 г.

Значная частка жыцця чалавека – праца. Пэўны яе кавалак займаюць таксама хобі і захапленні. Маці была шчаслівым чалавекам, таму што яе праца і была яе хобі. Напэўна, у гэтым быў сакрэт яе прафесійных поспехаў. Яна прысвячала вялікую частку сябе навуковай дзейнасці, універсітэту, акадэміі, кафедры і студэнтам. З’яўлялася актыўным навуковым дзеячам, сумяшчаючы яшчэ і кіраўніцкія функцыі загадчыка кафедры. І пры гэтым яна знаходзіла дастаткова часу на сваю вялікую сям’ю: мужа і траіх дзяцей. Гэта сведчыць аб яе прафесіяналізме і сапраўднай жаноцкасці.

Я добра памятаю яе працоўнае месца ў нашай кватэры, дзе яна праводзіла багата часу, друкавальную машынку, якую яны дзялілі збацькам, і вялікі пісьмовы стол, за якім нараджаліся навуковыя артыкулы, рыхтаваліся лекцыі і розныя рабочыя матэрыялы. Гэты пакой у нашай кватэры заўжды называўся кабінетам. Уздоўж яго сцен стаялі вялікія шафы, запоўненыя навуковымі кнігамі, брашурамі і часопісамі.

Выразна памятаю адзін ясны вясновы дзень, кабінет бацькоў, шторы, якія калыхаюцца ад парыву лёгкага ветру, стол, абкладзены кнігамі, і маці, якая задуменна сядзіць за друкавальнай машынкай, уносячы праўкі ў матэрыял, мабыць, рыхтуючыся да лекцыі або публікацыі. Гэта быў яе дзень нараджэння, і я прыйшоў уручыць ёй падарунак – пластыкавыя завушніцы, якія мне дапамагла выбраць прадавачка ў краме, распытваючы, які колер вачэй у маёй маці. Вымавіўшы віншавальную прамову, я ўручыў маме толькі што набытыя зялёныя завушніцы. Яна, пaглядаючы з усмешкай, падзякавала мне, абняла і тут жа паспрабавала іх прымераць. Маці была шчыра радая віншаванню і падарунку, нягледзячы на тое, што я адарваў яе ад працы. Мне тады было дзесяць гадоў.

Праз нейкі час у нашым доме ўпершыню з’явіўся камп’ютар, які я дапамагаў маме асвойваць. Як самы юны член сям’і, я ўжо тады меў прыхільнасць да сучасных тэхналогій. Гэты камп’ютар пасля доўга выкарыстоўваўся для працы бацькоў і для маіх гульняў.

Добра памятаю, што наша кватэра заўсёды была поўная жыцця, у ёй панавала навуковая атмасфера. Бацькі захоплена працавалі ў сваім кабінеце, дапамагаючы адноаднаму і кансультуючыся па розных пытаннях. Бясконцыя дыскусіі на навуковыя тэмы былі звычайнай справай у нашым доме.

Мы часта прымалі гасцей. Гэта былі калегі, з якімі абмяркоўваліся прафесійныя пытанні, студэнты, якія звярталіся па кансультацыю. У тыя гады я не разумеў да канца, чаму прыходзяць гэтыя людзі, але заўжды

назіраў іх удзячную рэакцыю. Часам з цікаўнасцю падслухоўваў, пра што вядзецца гаворка ў кабінеце падчас гэтых сустрэч. Пасля чаго, здаралася, распытваў маму, як ідуць справы ў калег, і называў іх прозвішчы. Гэта весяліла яе і адначасова здзіўляла, адкуль жа я іх ведаю. Некаторыя з іх былі частымі гасцямі ў нашым доме, а пра некаторых я чуў толькі з тэлефонных размоў. Вельмі спрытна аперыруючы прозвішчамі малазнаёмых мне людзей, я з сур’ёзным выглядам пытаўся пра іх справы.

Я вучыўся ў беларускамоўнай гімназіі. Памятаю, з якім нецярпеннем чакаў пераходу ў 8-ы клас, бо ведаў, што буду вучыцца па падручніку, адным з аўтараў якога была і мая мама. І калі гэты час урэшце надышоў, аднакласнікі пыталіся, ці праўда, што падручнік напісала мая мама, я з гонарам адказваў: «Так!». Не ўсе мне верылі, але гэта было і не важна. Аднойчы настаўніца беларускай мовы пацікавілася ў мяне, ці не прозвішча майго сваяка стаіць на вокладцы кнігі. Даведаўшыся, што падручнік напісаны з удзелам маёй мамы, яна папрасіла аб магчымасці пагутарыць з аўтарам асабіста. Пры гэтым настаўніца адзначыла цудоўную якасць вучэбнага матэрыялу падручніка. Для мяне гэта быў такі гонар! І, безумоўна, мне, як сыну аўтаркі, не хацелася яе падводзіць, таму на ўроках беларускай мовы я вельмі стараўся.

Вядома, у тыя гады я не ўсведамляў усяго маштабу асобы, якой была мая мама. Для мяне яна ў першую чаргу з’яўлялася клапатлівай і бясконца любячай матуляй. Толькі праз гады, калі яе не стала, я зразумеў значнасць зробленага ёю ў навуцы. Толькі зараз я магу ў поўнай меры ацаніць яе як прафесіянала і чалавека. І няхай я не пайшоў па навуковых слядах сваіх бацькоў і абраў іншую сферу дзейнасці, я хачу выказаць бязмерную ўдзячнасць маёй маме за шчаслівае дзяцінства і за тую дарогу, якую яна мне паказала ў жыцці. І хачу выказаць асобную падзяку прафесару Любові АдамаўнеАнтанюк за каштоўны навуковы ўклад у развіццё беларускай мовы.

Дзякуй, дарагая матуля! Нам цябе не хапае ...